**УДК 394.6 (476)**

# КІРМАШЫ Ў СТРУКТУРЫ САЦЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ І АБРАДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ ЗАХОДНЯГА ПАДЗВІННЯ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ 1920-1930-Х ГГ. ХХ СТ.)

***К. А. АНТОНАВА***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. наук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК)***

*У беларускай традыцыі кірмаш з'яўляўся важнай культурнай і грамадскай падзеяй, люстэркам развіцця грамадства. У адрозненне ад звычайнага жыцця, кірмаш прадастаўляў магчымасць для духоўнага задавальнення і ўзаемадзеяння паміж людзьмі розных этнічных і рэлігійных груп. Сакральная сутнасць свята супрацьпастаўлялася ў буднях, выяўлялася ў рытуальных і сімвалічных дзеяннях, звязаных з народнымі вераваннямі і культамі. У дадзеным артыкуле кірмаш разглядаецца ў структуры сацыяльнай культуры іабраднасці заходніх беларусаў.*

**Сімвалічныя аспекты кірмашу і яго сацыяльная культура.** Суаднясенне кірмашовых дзён з буйнымі каляндарнымі святамі і спецыфіка гандлёвых аперацый, не ўласцівых вяскоўцам у штодзённым жыцці, абумовілі наяўнасць значнай колькасці павер'яў і магічных прадпісанняў, якія суправаджалі падрыхтоўку да кірмашу і рэгламентавалі паводзіны чалавека на ім. Кірмаш цесна суадносіўся з ідэяй сакральнага як у часавым (прымеркаванасць да свят), прасторавым (правядзенне на храмавых плошчах, паблізу вясковых святынь: капліц, святых крыніц), так і сацыяльным (канцэнтрацыя людзей адпавядае падкрэслена калектыўнаму характару рытуалу) вымярэннях [7, с. 33].

Наведванне храма і ахвяраванне ля культавых крыніц было неад’емным элементам святочных кірмашоў у вёсках Гентава Міёрскага раёна і Калінавая Шаркаўшчынкага раёна. Уяўленні пра кірмаш ў якасці свята засталіся і ў народным фальклоры: «Будзець і на нашай вуліцы кірмаш», «будзе і на нашай вуліцы свята» [11, с. 144]. Святочны час правядзення кірмашу, калі акцэнт рабіўся на задавальненні духоўных запатрабаванняў чалавека і калектыву, у народнай свядомасці выразна супрацьпастаўляўся часу будзённаму, які меў выключна гаспадарчую прагматыку.

У вясковай традыцыі лічылася, на кірмашы чалавека з вялікай доляй верагоднасці магла напаткаць і небяспека зусім іншага кшталту – чары і сурокі. Таму выезд на кірмаш суправаджаўся разнастайнымі магічнымі прадпісаннямі і засцярогамі. Так, лічылася, што калі хто-небудзь на адлегласці ад хаты да мяжы вёскі пяройдзе дарогу чалавеку, які выпраўляецца на кірмаш, той не здолее прадаць свой тавар, а прывязе яго дадому. Калі хтосьці хваліць тавар або гандляра, трэба вымавіць сам сабе: «цур мяне». Нельга было таксама глядзець прама ў вочы нячыстым на руку людзям, інакш яны могуць сурочыць гандаль [3, с. 510].

У межах кансерватыўнай і адносна малалікай лакальнай супольнасці гандлёвыя аперацыі мелі падкрэслена персанальны характар, калі прынцыповае значэнне мела асоба як прадаўца, так і пакупніка. Для вяскоўца было важна ў каго ён набывае тавар, якім чынам гэты чалавек характарызаваны ў вясковым соцыуме, якія асабістыя стасункі звязваюць яго з прадаўцом [8, с. 46]. Таму ў традыцыйнай карціне свету вобраз гандляра займае адметнае месца. Так, калі прадавец чхае падчас размовы, то тавар будзе ўдалым. Таксама не не варта купляць тавар у чалавека, у якога свярбіць вачэй або нос. Нельга было купляць апошнія пакінутыя на прылаўку прадметы, інакш яны прынясуць няшчасце [3, с. 513]. А на Капыльшчыне Глыбокскага раёна меркавалі, што, калі ў прадаўца першым тавар набудзе мужчына, то гандаль пойдзе ўдалы, а калі жанчына – наадварот [7, с. 36].

У рамках традыцыйнай супольнасці надзвычай важнай была соцыа-нарматыўная функцыя кірмашу. На кірмашах сутыкалася вялікая колькасць людзей, якія належалі да розных этнасаў, сацыяльных груп, мясцовасцяў. На кірмашах не толькі адбываўся гандаль, але і ўсталёўваліся трывалыя сувязі гараджан і жыхароў мястэчак з навакольным сельскім насельніцтвам. Гэта спрыяла пашырэнню і ўмацаванню ўзаемаадносін паміж гарадскім і сельскім насельніцтвам, прадстаўнікамі розных этнасаў і веравызнанняў, выпрацоўцы ў іх агульных густаў, пранікненню ў вёску гарадскога стылю паводзін, звычак, моды і культурных навыкаў. У свой час П. Шпілеўскі пісаў «кірмаш заўсёды быў усеяны рознакаляровымі касцюмамі, сукенкамі, уборамі, фізіяноміямі і тварамі» [9 с. 55].

Кірмашы з'яўляюцца месцам, дзе сацыяльная культура праявілася ва ўсіх сваіх аспектах. Так, праз жарты і анекдоты людзі маглі выказваць свае погляды на розныя грамадскія з'явы, высмейваць недахопы і супярэчнасці ў паводзінах грамадства, а таксама падкрэсліваць свае каштоўнасці і перакананні. Кірмашовы гумар, часта утрымліваў жарты аб сацыяльных нормах і чаканнях, высмейваў неадпаведнасці і паказваў, што прымальна, а што непрымальна ў грамадстве за межамі кірмашу [5, с. 80]. Прадаўцы маглі выкарыстоўваць жарты, каб прадэманстраваць сваю перавагу. З іншага боку, пакупнікі маглі таскім чынам паспрабаваць збіць цану, кінуўшы выклік прадаўцам [5, с. 59].

**Кірмаш у структуры гульнёвых дзеянняў.** Працэс арганізацыі адпачынку на кірмашах у мястэчках з'яўляўся своеасаблівым паказчыкам сацыяльнага самаадчування насельніцтва і адным са спосабаў для ўлады знізіць узровень сацыяльнай напружанасці, выкліканай цяжкім матэрыяльным становішчам, адсутнасцю належнай сістэмы сацыяльнага забеспячэння насельніцтва, жыллёвымі праблемамі. Польскія ўлады гэта добра разумелі і побач з існуючымі цэнтрамі культурнага жыцця садзейнічалі развіццю розных забаўляльных мерапрыемстваў.

Пачынаючы з XX ст. на тэрыторыі Заходняй Беларусі пачалі праводзіць латарэі на святочных таргах. Бяспройгрышныя латарэі былі вельмі папулярныя, з прычыны таго, што ў гэтай латарэі кожны ўдзельнік гарантавана атрымліваў прыз. Разыгрываліся ў латарэях у асноўным грашовыя прызы розных памераў альбо ж прызы ў выглядзе тавараў. Спачатку розыгрышы былі дабрачыннымі, але далей яны трапілі у рукі махляроў, якія рабілі «бяспройгрышныя латарэі» і абдурвалі даверлівых пакупнікоў. Напрыклад, для «заману» побач хадзілі некалькі чалавек, трымаючы ў руках дыван або самавар і на пытанні прастадушных тлумачылі, што яны хвіліну таму выйгралі гэтыя рэчы. На самой справе ў лік выйграшаў не ўваходзілі гэтыя прадметы, а той, хто набыў білет, выйграваў, напрыклад, чайную лыжку [6, с. 139].

Аднак, з прычыны непрацягласі большасці беларускіх кірмашоў і немагчымасці папярэдняга распаўсюджання білетаў, значную папулярнась набылі латарэі-алегры, у якіх розыгрыш адбываўся адразу пасля куплі-продажу білетаў. Гэтыя гандлёва-фінансавыя дзеянні, у асноўным аднолькавыя па форме ўвасаблення і па характару разыгрываемых прызоў, мелі тэрытарыяльныя адрозненні. Так, у Браславе карыстлася папулярнасцю грашовая латарэя, дзе выйгрышы вызначаліся пры дапамозе папугая, які размяркоўваў галантарэйныя тавары: муштукі, грабяні, завушніцы і г.д.) Латарэі, як від гандлёвага дзеяння, увасабляліся на кірмашах у разнастайных формах, з’яўляліся своеасаблівым стымулятарам да ўдзелу людзей у кірмашах [6, с. 77].

Дастатковую папулярнасць здабылі латарэі-аўкцыёны: на гэтых латарэях прызы прадаваліся з аўкцыёну, а ўдзельнікі маглі рабіць стаўкі на ўпадабаныя ім лоты. Аўкцыён рэалізоўваў гульнёвы прынцып – конкурс, тым самым прыцягваў большую колькасць людзей. На аўкцыёнах удзельнічалі як мясцовыя фермеры і рамеснікі, так і купцы з іншых месцаў правядзенне аўкцыёнаў на кірмашах было звычайнай практыкай таго часу і дапамагала прадаўцам і пакупнікам заключаць здзелкі па выгадных цэнах. Удзельнікі аўкцыёнаў гандлявалі з дапамогай гандлёвай стойкі, на якой размяшчаліся прадметы продажу, а гандлёвы бант на галаве аўкцыяніста паказваў на тое, што дадзены прадмет будзе прадавацца праз аўкцыён. Аўкцыёны на кірмашах у Падзвінні былі не толькі месцам гандлю, але і грамадскім мерапрыемствам, дзе людзі збіраліся, размаўлялі, абменьваліся навінамі і парадамі. Такія аўкцыёны былі важнай часткай жыцця абшчыны і спосабам умацавання грамадскіх сувязяў [11, с. 79].

Вельмі распаўсюджанымі былі на кірмашах картачныя азартныя гульні. Карты як азартная гульня згадваюцца ў актавых матэрыялах Вялікага Княства Літоўскага ў XVII ст. як забароненая форма адпачынку. У часы Расійскай імперыі ўлады вялі ўпартую, але безвыніковую барацьбу з гэтым відам забаў (закрыццё ігральных дамоў, высылка гульцоў з гарадоў, ганенні на ўдзельнікаў азартных пацех). У адпаведнасці з заканадаўствам Расійскай імперыі афіцыйна дазваляліся толькі камерцыйныя гульні. Аднак дзеянне забаронных і тлумачальных дакументаў не паўплывала на знікненне азартных гульняў. Азартныя гульні пачалі квітнець і на кірмашах, і народных гуляннях, дзе арганізатарам няма чаго было баяцца дзеяння закона. Такім чынам азартныя гульні моцна прыжыліся ў якасці адной з забаваў на кірмашах [1, с. 22].

Яшчэ адной цікавай з'явай культурнага жыцця кірмашоў былі атракцыёны. У кірмашовую забаву ператварыўся старажытны вясновы магічны звычай беларусаў-катанне на арэлях, якое ў народзе лічылася сродкам ачышчэння чалавека пры дапамозе паветра. У XX ст. на кірмашах з'яўляюцца турніры асілкаў і змагароў, на якія кожная вёска выстаўляла свайго прадстаўніка. Праводзіліся спартыўныя гульні. На кірмашах заходнебеларускага Падзвіння былі пашыраны такія атракцыёны, як «Рыбалка», «Павук», «Слуп-кола», «Ледзяны конус» і г.д. [4, с. 74]. У пачатку XX ст. на кірмашах Беларусі з’яўляюцца конныя гульні. На Міёршчыне карысталася папулярнасцю перацягванне канату. Удзельнікі каманд прывязваліся вяроўкамі за пояс і да каната, цягнулі канат праз невялікі ручэй, і тыя, каго супернік перацягваў, валіліся ў ваду [6, с. 140].

Адметная рысай беларускіх кірмашоў была танцавальная забава. На кірмашах з’яўляюцца музыкі са скрыпкамі, гармоніямі, пад музыку якіх моладзь скача мясцовыя танцы (крутуху, бычка, барыню, лявоніху, кадрылю). Часта танцы насілі характар спаборніцтва, дзе ўдзельнікі імкнуліся заваяваць найбольшыя сімпатыі гледачоў. Трэба адзначыць, што ў танцах і песнях з'яўляліся элементы як беларускай, так і польскай, яўрэйскай і рускай музыкі, што адлюстроўвала культурнае ўзаемапранікненне традыцыйных культурных асаблівасцяў. Важным элементам згуртавання людзей на кірмашы з'яўляюцца кірмашовыя песні. Кірмашовыя песні, як правіла, мелі шэраг агульных тэм, у тым ліку святкаванне кірмашовай мітусні і весялосці, апісанне забаў, апяванне тавараў, якія прадаюцца на

кірмашы, пералік розных прафесій і рамёстваў, прадстаўленых на кірмашы, каментары аб цэнах і гандлі, апісанне сустрэч і знаёмстваў на кірмашы, апісанне традыцыйных кірмашовых страў і напояў (асаблівая ўвага надавалася гарэлцы). Таксама кірмашовыя песні часта адлюстроўвалі канкрэтныя геаграфічныя раёны і мясцовую культуру, маглі ўключаць згадкі пра мясцовыя славутасцях, стравах і звычаях [2, с. 14-15].

**Кірмашовы тэатр**. Паралельна з варыянтамі разнастайных забавы і гульняў масавага характару на местачковых штогадовых святочных таргах працягвае развівацца кірмашовы тэатр. Праводзіліся тэатральныя паказы са спецыфічным сюжэтам, якія ўключалі у сябе пераасэнсаваныя абрады, пародыі на рэлігійныя і народныя традыцыі, сатырычныя п'есы. У такіх выступах не было выразнага падзелу паміж акцёрамі і гледачамі, сцэнкі ствараліся калектыўна, тэкст быў часткова імправізаваным. Магчымасць гледача прыняць удзел у дзеянні ўзмацняла ўздзеянне відовішчнага і мастацкага аспектаў, робячы кірмаш яркім і запамінальным падзеяй. Выступленні вандроўных артыстаў на кірмашах працягваліся ў беларускіх губернях да 1917 г. Пасля ўстанаўлення савецкай улады на тэрыторыі Цэнтральнай і Усходняй Беларусі гэтыя творчыя гурты паступова сталі знікаць. Аднак у раёнах Заходняй Беларусі з 1921 г. вандроўныя артысты выступалі аж да Вялікай Айчынай вайны [4, с. 89]. У пачатку ХХ стагоддзя батлейка перастае існаваць як масавая з'ява і аддае відовішчную эстафету прафесійным тэатрам, але часам служыць як жывая газета. [10, с 44] Пашырэнне беларускай нацыянальнай культуры ў мястэчках праз тэатральную дзейнасць была важнай мэтай і формай барацьбы супраць гвалтоўнай паланізацыі для нацыянальных суполак, беларускіх культурнаасветніцкіх таварыстваў і саюзаў. Іх праца ў гэтым накірунку была шырокамаштабнай і вельмі плённай, але мела шмат перашкод з боку мясцовай адміністрацыі, паліцыі і самой сістэмы польскіх законаў. У сувязі з паступленнем інфармацыі аб тым, што нярэдка персанажы тэатральных пастановак беларускай ці рускай класічнай драматургіі выклікалі ў публікі непажаданыя асацыяцыі з польскім адміністрацыйна-паліцэйскім апаратам [7, с. 53]. Адметнай асаблівасцю самаарганізаваных тэатральных пастановак была іх часовая абмежаванасць і нізкі прафесійны ўзровень выканання ў міжваенны перыяд [10, с. 90]. Кірмашовыя тэатры не мелі пастаяннага месца выступу, а падарожнічалі ад кірмашу да кірмашы, ідучы за гандлёвымі караванамі.

Такім чынам беларускі традыцыйны кірмаш з'яўляўся важнай культурнай і грамадскай падзеяй, люстэркам развіцця грамадства. Ён служыў мостам паміж сельскімі і гарадскімі паселішчамі, узбагачаючы культурны багаж і веды народа. Сакральная сутнасць свята супрацьпастаўлялася будням, выяўлялася ў рытуальных і сімвалічных дзеяннях, забавах і атракцыёнах, звязаных з народнымі вераваннямі і культамі. Песні і жартаўлівыя выступленні паглыблялі разуменне кірмашовай традыцыі і яе культурнага значэння.

ЛІТАРАТУРА


1. Азартные игры в начале XX в.: историко-правовой аспект.: материалы VI Международной научно-практической конференции, Минск, 15–16 мая, 2013 г. / Беллорусский гос. экон. ун-т.; редкол.: В.Н. Шимов (отв. ред.) [и др.]. – БГЭУ, 2013. – 413 с.
2. Барышев Г. Театральная культура Белоруссии XVIII века / Г. Барышев. – Минск: Навука і тэхніка, 1997. – 187 с.
3. Васілевіч, У.А. Зямля стаіць пасярод свету. Беларускія народныя прыкметы і павер'і / / У.А. Васілевіч. – Мінск : уклад., прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча., 2010. – 547 с.
4. Гуд, П.А. Беларускі кірмаш / П.А. Гуд, Н.І. Гуд. – Мінск : Полымя, 1996. – 268 с.
5. Жарты, анегдоты, гумарэскі / Акадэмія навук беларускай ССР; рэдкал.: В. К . Бандарчык [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 441 с.
6. З гісторыі развіцця кірмашовай культуры Беларусі: материалы 76-й Региональной научно-практической конференции преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, Витебск, 1 марта 2024 г. / ВГУ имени П. М. Машерова, 2024. – 138 с.
7. Лобач У.А. Кірмаш у традыцыйных уяўленнях і фальклоры беларусаў / У.А Лобач // Беларускі гістарычны часопіс, – 2008. – №6. С. 33-36.
8. Сумко А.В. Абмен і гандаль у беларускім традыцыйным грамадстве як прадмет этналагічнага даследавання / А. В. Сумко // Вестник Полоцкого государственного университета: научно-теоретический журнал. – 2018. – № 1. – с. 54-58.
9. Шпилевский, П., Путешествие по Полесью и Белорусскому краю / П. Шпилевский. – СПб., 1858 (2016). – с. 242.
10. Энциклопедический словарь Брокгауза и Ефрона: в 86 т. / редкол.: И. Андреевский (гл. ред.) [и др.]. – СПб : Семеновская Типолитография (И.А. Ефрона), 1890. – с. 432.
11. Federowski, M. 24. Lud białoruski na Rusi Litewskiej: materyały do etnografii słowiańskiej zgromadzone w latach / M. Federowski, A. Obrębska-Jabłońska. – Krakow: Nakł. Akademii Umieję̨tności; skł. gł. w. księg. SpółkiWydawniczej Polskiej, 1897. – 159 с.